# Нашы юбіляры

## СЦЯПАН ЯФІМАВІЧ ЯНЧАНКА
### (Да 60-годдзя з дня нараджэння)



Споўнілася 60 год з дня нараджэння доктара эканамічных навук, прафесара, загадчыка кафедры палітычнай эканоміі гуманітарных факультэтаў БДУ імя У. І. Леніна Сцяпана Яфімавіча Янчанкі.

С. Я. Янчанка нарадзіўся ў вёсцы Анціпенкі Дубровенскага раёна Віцебскай вобласці ў беднай сялянскай сям'і. Працоўнае жыццё пачаў у 1941 годзе з выхавання дзяцей Ляднянскага дзіцячага дома. У гады Вялікай Айчыннай вайны — сакратар Горацкага, а потым Бялыніцкага падпольнага РК ЛКСМБ, памочнік камісара партызанскай дывізіі. Першыя пасляваенныя гады працуе сакратаром Магілёўскага, а потым Гомельскага гаркома, сакратаром Гомельскага абкома ЛКСМБ. У 1950 годзе С. Я. Янчанка з адзнакай закончыў гістарычны факультэт Гомельскага педагагічнага інстытута. Потым ён паглыбляе свае веды ў галіне палітычнай эканоміі ў Акадэміі грамадскіх навук пры ЦК КПСС. Тут у 1954 годзе паспяхова абараняе кандыдацкую дысертацыю і накіроўваецца на працу ў Беларускі дзяржаўны універсітэт імя У. І. Леніна, дзе працуе дацэнтам, загадчыкам кафедры палітычнай эканоміі гуманітарных факультэтаў.

У 1974 годзе С. Я. Янчанка паспяхова абараняе доктарскую дысертацыю на тэму «Узнікненне сацыялістычных вытворчых адносін», а ў 1976 годзе ён атрымаў вучонае званне прафесара па кафедры палітычнай эканоміі. Больш за 40 артыкулаў, 4 брашуры, 6 манаграфій — плён яго навуковай працы. У 1983 годзе выйшла ў свет манаграфія «Налог с оборота: теоретический очерк» — гэта новае слова беларускага вучонага па праблеме цэнаўтварэння ва ўмовах сацыялізму.

Прафесар С. Я. Янчанка актыўна ўдзельнічае ў грамадскім жыцці. Ён — член спецыялізаванага савета па прысуджэнню вучонай ступені доктара эканамічных навук пры Інстытуце эканомікі АН БССР, старшыня спецыялізаванага савета па прысуджэнню вучонай ступені кандыдата эканамічных навук у БДУ імя У. І. Леніна, старшыня Беларускага філіяла навуковага Савета АН СССР па комплекснай праблеме «Эканамічныя заканамернасці развіцця сацыялізму і спаборніцтва дзвюх сістэм», намеснік старшыні НТС Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР, старшыня НТС Мінвуза БССР, член рэдкалегіі часопісаў «Экономические науки» і «Веснік Беларускага дзяржаўнагаа універсітэта імя У. І. Леніна» (серыя III), галоўны рэдактар рэспубліканскага зборніка «Политическая экономия». У 1982 і 1983 гадах чытаў курс лекцый ў вышэйшых навучальных установах В'етнама. Выбіраўся сакратаром парткома БДУ, членам Ленінскага райкома КПБ г. Мінска.

Ратныя і працоўныя заслугі прафесара С. Я. Янчанкі адзначаны ордэнамі «Чырвонай Зоркі» і «Знак пашаны», шасцю медалямі, трыма ганаровымі граматамі Вярхоўнага Савета БССР, граматамі міністэрстваў вышэйшай адукацыі СССР і БССР, ён удастоены ганаровага звання Заслужаны работнік вышэйшай школы БССР і ўзнагароджаны знакам «Выдатнік народнай асветы».

Калектыў кафедры палітычнай эканоміі гуманітарных факультэтаў, калегі і вучні сардэчна віншуюць Сцяпана Яфімавіча з юбілеем і жадаюць яму моцнага здароўя, шчасця, новых творчых поспехаў.